# СУДОВЫЯ ЦЯЖБЫ ПА ПЫТАННЯХ МАЁМАСЦІ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

*В.М. Папко*
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь

У к. XVIII ст. фінансавае становішча рода Радзівілаў значна пагоршылася з-за падзей, звязаных з падзеламі Рэчы Паспалітай. Сярод прадстаўнікоў рода было нямала праціўнікаў дзеянняў расійскіх улад, якія захапілі гэтыя землі. Адным з самых актыўных быў кн. Станіслаў Радзівіл "Пане Каханку", нясвіжскі і алыцкі ардынат, самы багаты прадстаўнік роду. Некалькі гадоў разам з братам ён знаходзіўся ў эміграцыі. За гэты час яго маёмасць значна пацярпела, а сам ён быў вымушаны рабіць пазыкі. У 1790 г. ён памёр, пакінуўшы ўсе свае багацці ў спадчыну пляменніку кн. Дамініку Гераніму (1786-1813), якому на той час было толькі чатыры гады. Бацька кн. Дамініка, кн. Геранім Вінцэнт памёр у 1786 г. Вялікія пазыкі, што значыліся за гэтай спадчынай, не былі паплочаны. Некалькі гадоў паміж бліжнімі родзічамі маленькага спадкаемцы, кн. Мацеям і Міхалам Геранімам Радзівіламі ішла барацьба за права ажыццяўляць апеку над вялізарнымі маёнткамі, што нясло вялікія прыбыткі апекуну [8, с. 325]. У 1793 г. апекуном стаў кн. Міхал Геранім (1744-1831), які выконваў свае абавязкі да 1804 г., калі кн. Дамінік быў прызнаны паўналетнім. Гэты чалавек пражыў кароткае, але бурнае жыццё: удзельнічаў у вайне 1812 г. на баку Напалеона і памёр ад раны ў 1813 г. Пасля яго смерці паўстала пытанне, каму перадаць спадчыну. Справа ў тым, што адзіны сын Аляксандр быў пазашлюбным, а дачка кн. Стэфанія не магла атрымаць нерухомую маёмасць, якая пераходзіла ў спадчыну толькі мужчынскаму патомку. Рашэнне аб лёсе нясвіжскай і алыцкай ардынацый* было прынята імператарам Аляксандрам I у 1814 г., 17 сакавіка ён падпісаў указ аб прызначэнні наступнага ардыната, ім стаў кн. Антоні Генрык Радзівіл (1775-1833), траюрадны брат пакойнага кн. Дамініка.

Трошкі раней, 24 лютага 1814 г. выйшаў Указ аб стварэнні Камісіі па абследаванні пазык князёў Радзівілаў для арганізацыі іх пагашэння**. Не гледзячы на тое, што існавала тэрміновая патрэба вырашэння пытання з пазыкамі, з розных прычын толькі праз год былі прызначаны члены камісіі. Першыя гады працы камісіі паказалі, што неабходна дакладна размежаваць кола тых фукцый, якія яна павінна выконваць. Указам ад 6 жніўня 1816 г. быў зацверджаны парадак працы Камісіі, які афіцыйна назвалі «арганізацыяй». У 1817 г. імператар зноў быў вымушаны звярнуцца да праблем Радзівілаўскай камісіі, у дзейнасці якой было шмат парушэнняў і сутычак з саветам Апекуноў непаўналетняй князёўны Стэфаніі (афіцыйная назва савета - Апека). Было вырашана, што сферай дзейнасці камісіі будуць выключна судовыя справы, а іншыя пытанні трапілі пад юрысдыкцыю Адміністрацыі Маёнткаў Радзівілаў, якая падпарадкоўвалася Апецы. На чале камісіі стаяў Пракуратар, які таксама падпарадкоўваўся Апецы. На самой справе, чалавек, якія займаў месца пракуратара, валодаў вялізарнай уладай і фінансавымі магчымасцямі. Апекуны (або члены Апекі) не атрымлівалі грошы за сваю працу, аднак кожны з іх мог патраціць на ўтрыманне сакратароў, канцэлярыі і падарожжы штогадова 15 тыс. злотых з даходаў радзівілаўскіх маёнткаў, за што павінны быў здаваць рахункі [4, арк. 1-1 адв.]

---

* Ардынацыя - ад лац. ordinatio - "упарадкаванне", зямельнае ўладанне, якое лічылася непадзельнай і неадчужальнай маёмасцю якога-небудзь магнацкага рода, пераходзіла выключна ад аднаго да другога мужчынскага патомка.

** На рускай мове яна афіцыйна называлася: Комиссия по Высочайшему Повелению Устройства Радзивилловских дел учреждённая.

Вялікая колькасць пазык і неразбярыха ў паперах, прывялі да таго, што склаліся добрыя магчымасці да фальсіфікацыі дакументаў. Падаваліся неправамочныя іскі, даволі часта яны нават былі задаволены. Пры гэтым, фальсіфікацыяй займаліся як крэдыторы Радзівілаў, так і іх паўнамоцныя прадстаўнікі. Пасля смерці кн. Дамініка пачалася спекуляцыя яго маёмасцю. З'явіліся фальшывыя паперы, дазволы на продаж маёнткаў і г.д. Здараліся выпадкі, што некаторыя крэдыторы, пасля таго, як ім аддалі пазыку, паўторна прыходзілі з прэтэнзіямі. Адмову ў прэтэнзіях па вышэйпералічаных прычынах (фальшывыя дакументы або паўторныя прэтэнзіі) атрымалі Ельскія (1820), Ячэўскія, Маеўскі, Левіцкія (1821), Бітнеры, Карнішэўскія (1822), Гадлеўскія (1824), Туркевічы (1825) і многія іншыя. У некалькіх выпадках па адной прэтэнзіі крэдыторы атрамлівалі грошы па два разы, што ўсплывала толькі значна пазней [2, арк. 4-5].

У 1819 г. суд Камісіі разглядаў іск камергера Яна і маёра Станіслава Алендскіх, якія абвінавачвалі кн. Дамініка ў незаконным адабранні іх нерухомай маёмасці. Алендскія сцвярджалі, што ў красавіку 1807 г. князь незаконна адабраў у іх вёскі на тэрыторыі Капыльскага княства і не аддаў грошы. Пасля 1814 г. гэтая маёмасць лічылася часткай спадчыны кн. Дамініка і магла быць прададзена Пракуратарыяй у кошт пагашэння пазык. Суд Ракдзівілаўскай камісіі прыняў справу да разгляду, аднак вырашэнне пытання зацягвалася. Незадаволеныя браты Алендскія надрукавалі адкрыты ліст з тлумачэннем усіх акалічнасцей справы ў газеце "Кур'ер Літоўскі", для таго, каб падштурхнуць яе вырашэнне [5, с. 6].

Адзін з найбольш яскравых прыкладаў звязаны са справай графаў Тышкевічаў. Перад напалеонаўскай вайной кн. Дамінік прадаў за 2 млн. 820 тыс. злотых графу Міхалу Тышкевічу маёнтак Біржы, які некалькі стагоддзяў лічыўся адным з галоўных у родзе. З гэтай сумы на аплату пошліны паверана пакінуў 180 тыс. злотых. Як атрымалася, пошліна складала 169. 200 злотых, такім чынам, прадавец не атрымаў свае законныя 10. 800 злотых. У сувязі з гэтым генеральны пракурор Радзівілаўскай Массы Мікалай Маліноўскі падаў у суд на нашчадкаў графа Тышкевіча, яго сыноў Івана, Бенедыкта і дачку Йаганну [3, арк. 10-10 адв.] Радзівілаўская Масса імкнулася даказаць, што продаж адбыўся ў 1811 г. і быў незаконным, таму што імянным указам імператара ад 24 верасня 1811 г. адбыўся секвестр маёнткаў кн. Дамініка. Указ надрукавалі ва ўсіх губернях імперыі. Згодна ўказу, нельга было прызнаваць ніякія акты куплі-продажу, якія тычыліся маёнткаў кн. Дамініка, аднак канцылярыі Трокскага і Вількамірскага земскіх судоў прынялі і зарэгістравалі купчую на біржанскі маёнтак у снежні 1811 г. Тышкевічы імкнуліся даказаць, што продаж Біржаў адбыўся ў 1807 г. [3, арк. 35-36] У выйгрышу гэтай справы быў зацікаўлены кн. Віттенштэйн, паверания якога падалі на нашчадкаў графа ў суд, патрабуючы вяртання маёнтка, які, як аказалася, наогул не павінны быў прадавацца. Біржанская справа з графамі Тышкевічамі была адной з апошніх спраў Радзівілаўскай камісіі. Камісія прыняла рашэнне на карысць Віттенштэйнаў, Тышкевічы падалі 28 лютага 1838 г. апеляцыю на імя Мікалая I, якую прынялі да разгляду. Само па сабе гэта сведчыла аб аслабенні пазіцый камісіі, якая па палажэнні мела права канчатковага рашэння, не падлягаючага абжалаванню [3, арк. 209-212 адв.]

У ліпені 1837 г. у сувязі з судовым разбіральніцтвам па гэтай справе Радзівілаўская камісія звярнулася ў Віленскае Губернскае Праўленне і Грамадзянскую Палату з просьбай прадставіць звесткі "аб накладанні ў 1809 альбо 1810 годзе забароны на маёнткі Князя Дамініка Радзівіла: ці была яна знята і калі была, то калі менавіта?" [1, арк. 2] Две гэтыя ўстановы накіравалі ў адказ праўкі, што забарона на маёнткі кн. Дамініка была накладзена 30 сакавіка 1810 г. (за самавольны ад'езд за мяжу, без дазволу ўладаў) і знята ўказам ад 24 лютага 1814 г. Далей пачалі шукаць дакументы па гэтай

справе. Аказалася, што яны былі выкрадзены з Архіва Губернскага Праўлення. Пры гэтым адразу стала зразумела, каму было патрэбна выкрадаць дакументы. Калі б атрымалася, што забарона было накладзена ў 1810 г., а знята ў 1814 г., то купчая на Біржы ад 1811 г. лічылася б незаконнай. У такім выпадку, Мінская Грамадзянская Палата не мела права прыняць яе, як гэта адбылося. У следчых органах была распачата справа аб пошуку дакументаў, якія тычыліся секвестраваных маёнткаў кн. Дамініка і былі выкрадзены з Архіва Губернскага Праўлення. Следства па гэтай справе вялося з 1839 па 1844 г. і абмяркоўвалася на самым высокім дзяржаўным узроўні.

Следства прыйшло да высновы, што ў выкраданні папераў вінаватая Радзівілаўская Масса. Было прад'яўлена абвінавачванне памешчыку Антону Іванавічу Кажухоўскаму, які быў паверанным кн. Вітгенштэйна. Абвінавачванне атрымалі і некаторыя іншыя паверанныя Вітгенштэйнаў [1, арк. 550-557]. У жніўні 1844 г. выйшаў Указ Імператара Расійскай Імперыі аб перадачы справы ў Сенат. 6 верасня 1844 г. Віленскі генерал-губернатар выдаў распараджэнне аб закрыцці справы. У ім гаварылася: *"По решению общего собрания Правительствующего Сената, удостоенного Высочайшего подтверждения в 26 день июня сего года, по делу князя Виттгенштейна з графами Тышкевичами о Биржанском имении, беспорядки, открытые по архивам Виленского Губернского Правления и Гражданской Палаты, подавшие сей последний повод на выдачу разновидных свидетельств касательно запрещений, бывших будто бы на имении Бирже во время совершения поверенным князя Радзивилла купчей крепости оставлены без обсуждения и последствий, за Силою Всемилисти Манифеста 16 апреля 1841 (скорее всего, в документе ошибка – 1814 г.), но как следствие, производимое о том в Виленских присутственных местах, имеет предметом и самое отыскание утраченных журналов, то поручено мне сделать распоряжение об окончании сего дела на законном основании"* [1, арк. 565-565 адв.] Абвінавачаныя ў выкраданні дакументаў паверанныя на суды не з'яўляліся. Следства, якое цягнулася 5 гадоў, так і не змагло ні знайсці паперы, ні даказаць віну абвінавачаных.

Часам складваецца такое ўражанне, што адной з галоўных мэтаў супрацоўнікаў камісіі, а асабліва яе Пракуратараў, было як магчыма працягваць судовыя цяжбы, каб абгрунтаваць існаванне самой камісіі. У якасці найбольш характэрнага прыклада хацелася б узгадаць справу Пракураторыі з кн. Міхалам Геранімам Радзівілам, былым Віленскім ваяводай, бацькай кн. Антонія. На тыя часы ўжо не проста стары, а драхлы старац, быў уцягнуты ў судовыя разборы яго апекай над маёнткамі кн. Дамініка, якая скончылася ў 1804 г. У снежні 1829 г. разгляд гэтай справы быў адкладзены да пачатку наступнага года, каб падрыхтаваць неабходныя аргументы [7, с. 10]. Наколькі існавала неабходнасць падымаць справу апекі кн. Міхала, якая скончылася амаль 30 гадоў таму, і апякаемы князем Дамінік даўно загінуў? Самім старым князем гэтая судовая справа ўспрымалася як правалочка.

Існавалі цяжкасці са зборам крэдытораў на суды – яны па просту не хадзілі на паседжанні, па гэтай прычыне яны часта адкладваліся. Шматразова ў газетах друкаваліся аб'явы аб апошнім тэрміне, калі магчыма падаваць судовыя іскі (на пачатку дзейнасці камісіі) і аб назначэнні апошняга срока. У часы дзеяння Ізыдора Сальмановіча ў якасці Генеральнага пракурора Радзівілаўскай Массы, была зроблена свайго роду справаздача аб вядзенні гэтых судоў і аналіз тыпалогіі іскаў.

Усіх крэдытораў Камісія падзяляла ўмоўна на тры катэгорыі. Да першай адносіліся тыя, хто ў прызначаны срок не звярнуўся ў Галоўны Суд. Другую катэгорыю складалі тыя, што ў Галоўны Суд звярнуліся, але пасля гэтага не накіраваліся ў патрэбны тэрмін у Радзівілаўскую Камісію. Да трэцяй катэгорыі аднеслі крэдытораў, якія прайшлі праз этап Галоўнага Суда і падалі іск ў камісію, але далей па розных прычынах справу не давялі [2, арк. 6].

Судовыя цяжбы, звязаныя з падзелам маёнткаў на ардынацкія і аладыяльныя, а таксама з неабходнасцю выртання пазык былі вынікам падзей к. XVIII ст., калі кн. Станіслаў Радзівіл "Пане Каханку", змагаючыся за незалежнасць Рэчы Паспалітай, нарабіў пазык, блукаючы па Еўропе. Пазыкі гэтыя павінны быў выплаціць яшчэ яго спадкаемца, кн. Дамінік. Аднак, ён не вызначаўся гаспадарчымі талентамі і цікавасцю да эканамічных пытанняў. Кн. Дамінік актыўна прадаваў свае маёнткі, нават тыя, што лічыліся ардынацкімі і павінны былі заставацца радзівілаўскімі па палажэннях "хатняга права". Не гледзячы на гэта, кн. Дамінік не толькі не паплаціў пазыкі свайго дзядзькі і бацькі, але і нарабіў сваіх. Кн. Дамінік на свае грошы ўзбройваў і ўтрымліваў войска, якое ўдзельнічала ў вайне 1812 г. на баку імператара Напалеона.

## ЛІТАРАТУРА


1. Віленскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей ВДГА). Ф. 459, воп. 1, спр. 2764.
2. ВДГА. Ф. 459, воп. 1, спр. 3649.
3. ВДГА. Ф. 459, воп. 1, спр. 4019.
4. ВДГА. Ф. 459, воп. 1, спр. 4036.
5. Kuryer Litewski. – 1819. – 21 czerwca (№ 137). – С. 6.
7. Kuryer Litewski. – 1829. – 9 grudnia (№ 147). – С. 10.
8. Zielińska T. Poczet polskich rodów arystokratycznych. – Warszawa. – 1997. – 592 с.


# SZKOLNICTWO W OKRESIE ZARZĄDU CYWILNEGO ZIEM WSCHODNICH (8 LUTY 1919 R. - 9 WRZEŚNIA 1920 R.)


*Andrzej Smolarczyk*
Białystok


Klęska armii państw centralnych na froncie zachodnim w 1918 r. oznaczała rychłą zmianę stosunków politycznych na terenach wschodnich, które nadal pozostawały pod okupacją niemiecką. Odradzające się państwo polskie liczyło na przejmowanie terenów opuszczanych przez wojska niemieckie, które pomimo poniesionej klęski stanowiły na wschodzie realną siłę militarną i polityczną. Władze niemieckie jak najdłużej chciały wykorzystywać tę przewagę w celu wywierania wpływu na życie polityczne, zwłaszcza uciekając się konfliktowania narodów zamieszkujących te terytoria. Stosowaną przez nie naczelną zasadą polityczną było tworzenie „celowego chaosu", którego głównym celem miało być osłabianie pozycji strony polskiej.[1]

Wycofanie się Niemców jesienią 1918 z ziem dawnego Wielkiego Księstwa Litewskiego umożliwiło proklamowanie 1 stycznia 1919 roku Białoruskiej Socjalistycznej Republiki Radzieckiej. W styczniu 1919 r. po rokowaniach polsko-niemieckich odziały polskie mogły dokonać przemarszu przez tereny okupowane przez Niemców.[2] 8 lutego Józef Piłsudski powołał na ziemiach litewsko-białoruskich Zarząd Wojskowy. Wkrótce terytoria te zostały zajęte przez wkraczające tu wojska polskie.[3] Generalnym Komisarzem Cywilnym przy Zarządzie Wojskowym Kresów Wschodnich został Ludwik Kolankowski. Pozostawał on

---

[1] J. Gierowska-Kałłaur, *Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego 1919 - 9 września 1920)*, Warszawa 2003, s. 31-32.

[2] S. Walasek, *Szkolnictwo powszechne na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej (1915-1939)*, Kraków 2006, s. 57-58.

[3] Zanim ukształtowały się władze polskie inicjatywę przejmowania terenów od Niemców rozpoczęła ludność polska organizująca się w organizacje militarne: Związek Wojskowych Polaków Miasta Wilna, Rada Narodowa Ziemi Lidzkiej, oddziały Samoobrony. W listopadzie 1918 r. powstał Departament Litewsko-Białoruski przy MSZ oraz Józef Piłsudski wydał rozkaz o formowaniu Dywizji Litewsko-Białoruskiej.